# I.2.1.3.
# Жалезны век

Жалезны век на тэрыторыі Беларусі пачаўся ў VIII/VII стст. да н.э. і
працягваўся да сярэдзіны I тыс. н.э. Насельніцтва Беларусі выраблялa жалеза
15
з балотнай і лугавой руды. Гэта сыравіна была шырока распаўсюджана, а яе
перапрацоўка ў невялікіх ***печках-домніцах*** не ўяўляла складанасці, таму
жалеза хутка і амаль цалкам выцесніла камень. Медзь і бронзу пачалі выкарыстоўваць амаль выключна для ўпрыгажэнняў.



Разнастайныя і эфектыўныя прылады працы, металічная зброя, развітыя жывёлагадоўля і падсечна-ворыўнае земляробства паскорылі гаспадарчае і грамадскае развіццё. Яшчэ больш павялічвалася маёмасная няроўнасць паміж родамі і нават асобнымі сем'ямі. Назапашваюцца багацці. Лішак прадуктаў ішоў на абмен.

На тэрыторыю Беларусі траплялі імпартныя тавары з далёкіх краёў – з грэка-рымскага Прычарнамор'я, ад кельтаў Цэнтральнай Еўропы. У сваю чаргу, беларускія землі былі важным пасрэднікам у гандлі прыбалтыйскім бурштынам. Абмен быў пераважна натуральным – рэч за рэч. Аднак ужо ў першых стагоддзях нашай эры ў
якасці грошаў магл



Надзейным спосабам захавання набытых багаццяў ад разрабавання суседзямі стала будаванне вакол паселішчаў умацаванняў з зямлі і дрэва, якія называюць ***гарадзішчамі***. Вёскі пачалі размяшчаць на цяжкадаступных узгорках, прырэчных мысах, абводзілі іхваламі і равамі, агароджвалі драўляным парканам або сцяной. За ўмацаваннямі гарадзішчаў знаходзіліся
будовы, загоны для жывёлы.





У жалезным веку тэрыторыю Беларусі засялялі плямёны розных ***археалагічных культур***, якія адрозніваліся між сабой тыпамі жытлаў, асаблівасцямі пахавальнага абраду, формай і арнаментацыяй посуду, зброяй, прыладамі працы і ўпрыгажэннямі.




Плямёны жалезнага веку на тэрыторыі Беларусі:
1 — мілаградскай культуры; 2 — зарубінецкай культуры; 3 — штрыхаванай керамікі культуры; 4 — днепра-дзвінскай культуры; 5 — паморскай культуры; 6 — вельбарскай культуры

Паўднёвы ўсход Беларусі і прылеглую частку Украіны займалі плямёны ***мілаградскай*** культуры. Яны першымі пазнаёміліся з жалезам. Мілаградцы жылі на гарадзішчах і на селішчах, дзе меліся зямлянкі з агнішчамі, наземныя збудаванні, ямы-склепы. Памерлых яны хавалі пад невялікімі курганамі або ў грунтовых магілах па абраду трупаспалення (крэмацыі). На жыццё мілаградцаў значны ўплыў аказваў скіфскі свет Паўночнага Прычарнамор'я. Герадот апісвае паўночных суседзяў скіфаў – ***неўраў***. Шэраг даследчыкаў атаясамлівае неўраў з носьбітамі мілаградскай культуры.






У III ст. да н.э. мілаградская культура змянілася ***зарубінецкай***. Жытламі зарубінцаў былі паўзямлянкі і наземныя будынкі. Спаленыя рэшткі нябожчыкаў яны хавалі ў невялікіх ямах. Зарубінцы і іх нашчадкі праіснавалі да сярэдзіны I-га тысячагоддзя н.э.








У II ст. н.э. паўднёва-заходнюю частку Брэсцкай вобласці закранула
міграцыя з узбярэжжа Балтыкі і Прычарнамор'я германскіх плямёнаў ***готаў***.

У пошуках новых земляў яны рухаліся старадаўнім бурштынавым шляхам з Віслы на Буг.








Цэнтральную і большую частку паўночна-заходняй Беларусі займалі
плямёны ***культуры штрыхаванай керамікі***, названыя так па характэрным гліняным посудзе. Яны жылі тут з пачатку жалезнага веку да першых стагоддзяў нашай эры. Штрыхавікі жылі амаль выключна на гарадзішчах у вялікіх наземных хатах. Памерлых хавалі па абрадзе, які не захоўваў слядоў м








Беларускае Падзвінне і Верхняе Падняпроўе засялялі плямёны ***днепра-дзвінскай культуры***, блізкай па сваім характары да культуры штрыхаванай керамікі. Як штрыхавікі, так і днепра-дзвінцы адставалі ў сваім развіцці ад плямёнаў паўднёвай Беларусі. Так, яны запазніліся з авалоданнем жалезаробчай справы, таму на ранніх этапах сваёй гісторыі яшчэ шырока карысталіся каменнымі вырабамі. Больую частку часу яны займаліся паляваннем, рыбалоўствам, збіральніцтвам, ляснымі промысламі.






Большасць сучасных даследчыкаў лічыць, што ў этнічынм сэнсе асноўная маса насельніцтва тэрыторыі Беларусі была ***балтамі***, якія з’яўляюцца продкамі сённяшніх латышоў і літоўцаў.

# ЯКІЯ ЁСЦЬ ПЫТАННІ?